**Мікіта Супрунчук**
**Беларускі дзяржаўны універсітэт**

# КАНКУРЭНЦЫЯ ЭЛЯТЫВА І СУПЕРЛЯТЫВА НА СТАРОНКАХ “НАШАЙ НІВЫ”

Нам вядомы старажытны афарызм пра тое, што ўсё пазнаецца ў параўнанні. А вынік пазнання адлюстроўваецца ў маўленні, у тэкстах. Так фіксуюцца звесткі пра месца, час, памер, колькасць, уласцівасць прадметаў, з’яў. Характарызуючы нешта паводле ўласцівасці, часам неабходна паказаць яе ступень, выявіць, наколькі моцная нейкая якасць, гэта значыць, праградуіраваць названую якасць. Галоўным сродкам выражэння семантычнай катэгорыі градацыі ў беларускай мове з’яўляецца катэгорыя ступеняў параўнання. Разгледзім асаблівасці ўжывання ступеняў параўнання прыметнікаў на старонках газеты “Наша Ніва” на прыкладзе аналізу трыццаці трох нумароў газеты за жнівень – кастрычнік 2006 года.

Аналізуемая катэгорыя ўключае тры грамемы. Звычайная (або станоўчая, або пазітыў) ступень паказвае, што прадмет валодае ўласцівасцю, названай прыметнікам. Вышэйшая ступень (або кампаратыў) паказвае на праяўленне названай якасці ў большай (ці меншай) ступені ў параўнанні з іншымі прадметамі ці з тым жа прадметам у іншы час. Найвышэйшая ступень (або суперлятыў) перадае гранічную (самую высокую ці самую нізкую) ступень праяўлення пэўнай якасці ў параўнанні з іншымі прадметамі ці з тым самым прадметам у іншы час.

Намі былі выяўлены памылкі ва ўтварэнні ступеняў параўнання, гэта значыць, па-першае няправільна пабудаваныя формы, па-другое, памылкі ў канструкцыях з імі і, па-трэцяе, памылкі ва ўжыванні ступеняў параўнання, гэта значыць формы будаваліся правільна, але выкарыстоўваліся недарэчна, з парушэннем нормы. Звернемся да тэкстаў.

1. Амерыканская выведка прыйшла да высновы, што атака атамнай «бруднай бомбай», хутчэй за ўсё, непазбежная ў *бліжэйшую* дэкаду (В. Данішэвіч. Навум Хомскі: Мусаліні, Сталін, Буш).

2. Скончыла *вышэйшую* Мастацкую Школу ў Парыжы, пазней – лінгвістычнае аддзяленне Сарбонскага універсітэта (Сёння ў Варшаве сустрэча з Івонкай Сурвіллай).

3. Трэба сказаць, што «Laisvas Laikrastis» – гэта тыднёвік, што спецыялізуецца на журналісцкіх следствах, асабліва што датычыць карупцыі ў *вышэйшых* эшалонах уладаў (М. Бугай. Скандал у Літве: Пацюнас забіты сваімі?).

4. Менавіта Зміцер падтрымліваў нас у *цяжэйшыя* моманты (І. Шыла. Скажам Дзякуй...).

5. Прычым лабіраваннем *жарстчэйшага* падыходу займаюцца найперш праваабаронцы, недзяржаўныя арганізацыі – то бок не самыя ўплывовыя структуры (А. Класкоўскі. Шматвежавы Крэмль і шматофісная Эўропа).

6. Банальны прыклад – менеджэр сярэдняга звяна ніколі не дазволіць сабе набыць машыну, на якіх ездзяць менеджэры *вышэйшага* (Э. Канплінскі. Рэчы, дзеля якіх мы жывём).

Для больш паспяховага разгляду аналізуемай з’явы мэтазгодна ўвесці яшчэ адно паняцце – элятыў. Ён і прадстаўлены ў вышэйпададзеных сказах. Элятыў – гэта таксама значэнне з поля градацыі, якое абазначае безадносна высокую ступень якасці. Пры ўжыванні элятыўных форм маецца на ўвазе, што ў пэўнага прадмета якасць праяўляецца максімальна, гранічна, дасягае сваёй вяршыні. Такая кваліфікацыя даецца як эмацыянальная ацэнка, без супастаўлення з іншымі прадметамі. Гэты максімум існуе абсалютна, а не адносна нечага. Значэнне элятыва адрозніваецца ад значэння суперлятыва тым, што ў першым выпадку выказваецца ацэнка, меркаванне, а другім праводзіцца супастаўленне, робіцца выснова з вопыту, назірання – з параўнання. Адсутнасць параўнання ў сітуацыі з элятывам выводзіць яго па-за межы катэгорыі ступеняў параўнання. Гэта, аднак, безумоўна, не перашкаджае яму заставацца членам семантычнай катэгорыі градацыі. Названае адрозненне элятыва ад суперлятыва можна спрабаваць выяўляць шляхам моўнага эксперыменту: змяняць сінтэтыч-

ную форму правяраемай ступені параўнання на аналітычную (са словамі *самы, з усіх*). Калі такая замена магчымая – перад намі суперлятыў, калі не – элятыў. І элятыўнае, і суперлятыўнае значэнне перадаюцца ў беларускай мове формамі тыпу *найвялікшы, найвыдатнейшы* (з суфіксамі *–эйш-, -ейш-, -ш-* і абавязковай прыстаўкай *най-*). Значыць, ва ўсіх вышэйпададзеных прыкладах патрэбныя выпраўленні.

Адзначым, што ад тых самых прыметнікаў былі выяўлены і рэдкія правільныя формы:

7. Затое з *найвышэйшай* лігі ўжо дакладна вылятае бабруйская «Белшына» («Шахтар» выбыў з чэмпіёнскай гонкі).

*8. Найбліжэйшым* часам гэтае пытаньне будзе ўзьнятае (Віка Мароз ня вернецца ў вялейскі інтэрнат).

Думаецца, што падобныя прыклады з’яўляюцца пад уплывам аналагічных рускіх форм.

**Літаратура**

1. Беларуская граматыка: У 2 ч. / Пад. рэд. М. В. Бірылы, П. П. Шубы. – Мінск: Нав. і тэхн., 1985. – Ч. 1.

2. Воротников, Ю. Л. Степени качества в современном русском языке / Ю. Л. Воротников. – М.: Азбуковник, 1999.

3. Сцяцко, П. У. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П. У. Сцяцко, М. Ф. Гуліцкі, Л. А. Антанюк; Пад рэд. М. В. Бірылы, П. У. Сцяцко. – Мінск: Выш. шк., 1990.